

## СА СВЯТАМ!

Заўтра -- 8 Сакавіка. Яшчэ не так даўно гэтага дня чакалі з прыўзнятым настроем, асабліва лепшая палавіна чалавецтва -- жанчыны. Бо з названай датай звязана іх свята. Да яго рупліва рыхтавалася моцная палавіна чалавецтва -- мужчыны. Яны набывалі для сваіх матуль, жонак і каханых, сясцёр і дачок падарункі, куплялі кветкі і дарылі іх з асаблівай пяшчотай, па многіх адрасах адпраўлялі віншавальныя паштоўкі і тэлеграмы, выказвалі найлепшыя пажаданні па тэлефоне.

Цяпер жа зусім не тое, што было раней. Адно не змянілася: 8 Сакавіка застаўся святочным, выхадным днём. Што ж тычыцца яго былых атрыбутаў, дык вельмі многім гэта стала не па кішэні. І ўсё ж мы не павінны траціць аптымізм, збядняцца на поўныя цяпла, шчырасці і сардэчнасці словы.

Са святам Вас, дарагія жанчыны! Ніколі не страчвайце веру ў сябе. Усім Вам поспехаў у працы і вучобе, на ніве грамадскай дзейнасці, дабрабыту і моцнага здароўя на доўгія гады!

**РЭКТАРАТ, ПРАФКОМ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.**

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт



№ 4(886) | АЎТОРАК, 7 сакавіка 1995 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ ГДУ

Асноўным на парадку дня чарговага пасяджэння Савета універсітэта, якое адбылося 23 лютага, было пытанне аб арганізацыі вучэбнага працэсу на спецыяльнасці "Правазнаўства". Заслуханы і абмеркаваны даклад дэкана гісторыка-юрыдычнага факультэта М.І.Старавойтава. У прынятай пастанове прадугледжаны меры для карэннага паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў па названай спецыяльнасці.

На савеце размеркаваны сродкі, выдзеленыя з бюджэту рэспублікі на фінансаванне фундаментальных даследаванняў у 1995 годзе, зацверджаны тэмы кандыдацкіх дысертацый і імянныя стыпендыяты, старшы выкладчык кафедры рускай літаратуры І.М.Афанасьеў рэкамендаваны ў дактарантуру. Прынята рашэнне аб перайменаванні кафедры ЛФК у кафедру аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры.

На конкурснай аснове на вакантныя пасады дацэнтаў абраны: А.П.Касьяненка -- па кафедры палітычнай сацыялогіі, Р.І.Маркелава -- па кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, В.А.Мядзведзеў -- па кафедры фізічнага выхавання, А.Я.Нікіфараў -- па кафедры бухуліку і аналізу гаспадарчай дзейнасці, У.У.Сыцько -- па кафедры фізічнай метралогіі. А.Г.Краўчанка абрана старшым выкладчыкам кафедры геаграфіі.

Савет універсітэта прыняў рэкамендацыі Атэстацыйнай калегіі Мінадукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь аб прысваенні вучонага звання прафесар доктару філалагічных навук, загадчыку кафедры беларускай літаратуры І.Ф.Штэйнеру, вучонага звання дацэнт -- кандыдатам навук І.М.Елісеевай з кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ і С.М.Курылкінай з кафедры фізічнай метралогіі.

На Савеце былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

23 лютага на пасяджэнні Савета універсітэта зацверджаны імянныя стыпендыі.

**Імя Ф.СКАРЫНЫ:**

**Бабына Іне** -- студэнтцы 5 курса эканамічнага факультэта /з 1 студзеня/;

**Крэшчык Людміле** -- студэнтцы 4 курса гісторыка-юрыдычнага факультэта /з 1 лютага/;

**Кабялка Вольэе** -- студэнтцы 3 курса факультэта фізічнай культуры /з 1 лютага/.

**Імя акадэміка О.ШМІДТА:** /з 1 лютага/

**Русакову Сяргею** -- студэнту 4 курса, **Казлову Уладзіславу, Гапановічу Мікалаю** -- студэнтам 3 курса матэматычнага факультэта.

**Імя Я.Купалы:**

**Сурыновіч Вікторыі** -- студэнтцы 4 курса філалагічнага факультэта /з 1 лютага/.

**Імя акадэміка Ф.І.ФЁДАРАВА:** /з 1 студзеня/

**Савенку Дзмітрыю, Уткіну Дзмітрыю** -- студэнтам 5 курса фізічнага факультэта.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты горача віншуюць кандыдата фізіка-матэматычных навук з кафедры алгебры і геаметрыі намесніка дэкана матэматычнага факультэта Аляксандра Васільевіча БУЗЛАНАВА і Івана Рыгоравіча ТРАФІМОВІЧА з кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту з выпадку прысваення ім Атэстацыйнай калегіяй Мінадукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь вучонага звання ДАЦЭНТ.*

◆◆◆

*Калектыў кафедры эканомікі і сацыялогіі працы горача віншуе выпускніцу аспірантуры КАЛЕСНІКАВУ Ірыну Іванаўну /навуковы кіраўнік -- дацэнт І.П.Трацэўскі/ з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.*

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны старшы выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту Васіль Дзмітрыевіч ПАДАСІНАЎ і загадчык кафедры агульнай фізікі доктар тэхнічных навук прафесар Дзмітрый Рыгоравіч ЛІН.

# УНІВЕРСІТЭЦКАЙ ЗДРАЎНІЦЫ -- 20гадоў



Няма нічога даражэй на свеце, чым здароўе. Калі чалавек адчувае сябе добра фізічна, то ў яго і адпаведны настрой, калі ж не -- увесь свет, як кажуць, не мілы. У апошнім выпадку на дапамогу нам прыходзяць медыкі, каб суняць фізічны боль, зняць трывогу, усяліць надзею на хуткае выздараўленне.

Шмат гадоў стаяць на варце здароўя студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ работнікі універсітэцкага санаторыя-прафілакторыя. На мінулым тыдні яго калектыў прымаў цёплыя віншаванні ад кіраўніцтва ГДУ, а таксама сваіх удзячных пацыентаў з нагоды юбілею -- 20-годдзя універсітэцкай здраўніцы. За гэтыя гады ў яе сценах атрымалі лячэнне і прайшлі аздараўленне тысячы студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Клопатам, увагай, добразычлівымі адносінамі ўрачоў, медсясцёр быў тут акружаны кожны, хто набываў сюды пуцёўку.

Размяшчэнне прафілакторыя побач з універсітэцкімі карпусамі і інтэрнатамі мае свае станоўчыя перавагі: пасля вучобы, работы, нават у абедзенны перапынак тут можна атрымаць прызначаныя ўрачом працэдуры, што дазваляе з"эканоміць свой час. А калі дадаць да гэтага тую цеплыню і ўважлівыя адносіны персаналу да ўсіх, хто тут папраўляе здароўе, то гэта ўздымае і настрой, што вельмі немалаважна ў нялёгкі сённяшні час.

Дваццаць гадоў -- немалы адрэзак часу, за які універсітэцкая лячэбна-прафілактычная ўстанова змагла набыць сапраўдную сталасць. Цяпер яна валодае выдатнай сучаснай медыцынскай базай, што дазваляе высокаэфектыўна праводзіць лячэнне. Не так даўно прафілакторый стаў навасёлам -- з універсітэцкага інтэрната N3, у якім ён займаў адзін пад"езд, перамясціўся ў двухпавярховы будынак былога дзіцячага садка. І цяпер тут утульна і прасторна ўсім работнікам санаторыя і тым, хто лечыцца ў ім і адпачывае. За прайшоўшыя гады значна ўзрасла колькасць лячэбных кабінетаў /у самым пачатку існавання ўстановы іх тут было толькі 2 -- працэдурны і фізіятэрапеўтычны/. Цяпер жа да паслуг пацыентаў іх звыш 10: камп"ютэрнай дыягностыкі, лор-кабінет, гінекалагічны, магнітатэрапіі, зубны, іголкатэрапіі, масажны, цеплалячэння, інгаляторый, працэдурны, фізіятэрапеўтычны. Некаторыя прыборы і апараты не маюць аналагаў не тое што ў вобласці, нават і ў рэспубліцы. Сярод іх дыягнастычны камп'ютэрны комплекс "Прагноз" /Карэя/, апараты "Каскад", "Гінетон".

З шырокай лячэбнай базай звязана, натуральна, і колькасць штатных медработнікаў. Цяпер іх у прафілакторыі 38 чалавек. Сярод іх 6 урачоў і 6 медсясцёр. Высокую кваліфікацыю маюць неўрапатолаг-іголкарэфлексарэрапеўт Л.У.Марысая, лор-урач Л.Ф.Барадуха, урач-гінеколаг Н.А.Чапурная, зубны ўрач А.П.Дуброўская, тэрапеўт А.Я.Шалухіна, старшая медсястра Т.Г.Струкава, масажысткі Т.А.Хамутоўская, Т.В.Маісеенка, медсёстры Н.Л.Васіленка, Я.У.Маркава, В.Р.Гульцяева, І.Р.Раманенка.

Цяпер у санаторый-прафілакторый у адзін заезд могуць атрымліваць пуцёўкі 140-150 чалавек /у першыя гады пасля яго адкрыцця -- 75/. Многім ва універсітэце спадабалася і такое новаўвядзенне як продаж курсовак на лячэнне. Іх штомесячна могуць набыць 30 чалавек.

Калі прыходзіш у гэтую лячэбную ўстанову, заўсёды заўважаеш узорную чысціню і парадак усюды -- у холах, лячэбных кабінетах, што стварае добры настрой. А ён у працэсе аздараўлення адыгрывае далёка не апошнюю ролю. Усё гэта сведчыць аб тым, што ў гэтым доме ёсць сапраўды добры гаспадар. І вось ужо адзінаццаць гадоў такой клапатлівай і дбайнай гаспадыняй з'яўляецца галоўны ўрач санаторыя-прафілакторыя Святлана Аляксееўна Залатых. За патрабавальнасць і добразычлівасць, кампетэнтнасць спецыяліста-медыка яе паважаюць і ў калектыве, якім яна кіруе, і тыя, хто папраўляе тут здароўе. Таму нельга лічыць выпадковасцю, што здраўніца ГДУ двойчы прызнавалася лепшай сярод санаторыяў-прафілакторыяў ВНУ рэспублікі за высокія дасягненні ў справе ўмацавання здароўя студэнцкай моладзі.

Здароўе чалавека ў многім залежыць ад яго харчавання. Гэта добра разумеюць работнікі такога важнейшага падраздзялення санаторыя як сталовая. Тут працуюць сапраўдныя майстры кулінарнай справы повары В.М.Грамыка /тут яна ўжо 19 гадоў/, Н.І.Кузняцова, кухонная рабочая Л.П.Нечыталюк і многія іншыя.

Жыццё ў нас цяпер нялёгкае. Не хапае грошай на санаторную пуцёўку на курортнае лячэнне ў славутыя раней месцы былога СССР. Таму мы ўсе вельмі ўдзячны работнікам універсітэцкай здраўніцы, якія клапоцяцца аб нашым здароўі, заўсёды сустракаюць нас цеплынёй і сардэчнасцю.

З юбілеем Вас, шаноўныя!

**Т.ДУБЯК.**

**На здымку: калектыў санаторыя-прафілакторыя.**

**Фота У.Чысціка.**

## ШЧЫРА ДЗЯКУЮ!

Атрымалася так, што па стану здароўя я быў вымушаны звярнуцца ў прафком за пуцёўкай ва універсітэцкі санаторый-прафілакторый.

Пуцёўку мне прадставілі і дні яе хутка праляцелі.

У гэтай сувязі хочацца выказаць словы падзякі ўсім тым, хто працуе для нас.

Даводзіцца толькі здзіўляцца, як атрымліваецца ў дыетсясцёр і кухароў растастайная ежа пры тым, што амаль кожны дзень цэны на прадукты харчавання растуць, а прадукты, якія неабходны, не заўсёды бываюць на базах.

Хочацца пажадаць усяму калектыву санаторыя-прафілакторыя моцнага здароўя, творчых поспехаў у рыхтаванні ежы і ўсяго самага найлепшага! А з улікам таго, што ў вас амаль на 100% жаночы калектыў -- усіх Вас са святам 8 Сакавіка!

**В.МАРЧАНКА,**
**ст. выкладчык кафедры фізічнага выхавання .**



# ЮБІЛЕЙ "АПОСТАЛА" ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

**У гэтым месяцы спаўняецца 470 гадоў з дня выхаду апошняй кнігі Ф.Скарыны -- "Апостал". Яна надрукавана ў Вільні ў 1525 г. Гэта апошняя, 45-я кніга, выдадзеная ўсходнеславянскім першадрукаром.**

У мінулым стагоддзі ў свеце існавала 15 экземпляраў гэтай кнігі, цяпер вядома месцазнаходжанне толькі 10-ці: 2 -- у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы (былая Ленінка), 2 -- у Публічнай бібліятэцы імя М.Е.Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбурзе, 2 -- у Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве, 1 -- у Музеі ўкраінскага мастацтва (г.Львоў), 1 -- у Цэнтральным дзяржаўным архіве старажытных актаў (г.Масква), 1 -- у Навуковай бібліятэцы Вільнюскага універсітэта і 1 -- у Каралеўскай бібліятэцы ў Лондане. Сляды пяці кніг згубіліся.

Гэта адна з частак Новага запавету Бібліі, ананімны раннехрысціянскі твор. Складаецца з дзвюх частак. Першая з іх расказвае пра дзеянні апосталаў -- іерусалімскіх вучняў Хрыста, другая змяшчае пропаведзь апостала Паўла, "выказаную ў форме яго 14 пасланняў да розных асоб і народаў" (Ф.Скарына. Творы. Прадмовы, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. Мн., "Навука і тэхніка", 1990. С. 183). Ф.Скарына даў ёй такі загаловак: "Кніга дзеянняў і пасланняў апостальскіх, называемая Апостал". Яна суправаджаецца агульнымі прадмовай і пасляслоўем, кожная частка таксама суправаджаецца прадмовай і пасляслоўем. Усяго ў гэтай кнізе 22 уступныя артыкулы Ф.Скарыны. Пасля агульнай прадмовы змешчаны "саборныя пасланні апостала Паўла, у якіх выкладаюцца асновы хрысціянскай веры і ранняя гісторыя хрысціянства." (Ф.Скорина и его время. Энциклопедический справочник. Мн.; БелСЭ им. П.Бровки, 1990. С.237). У прадмовах да гэтай кнігі і яе частак Скарына коратка пераказвае іх асноўны змест. У іх ёсць шмат разумных выказванняў на свецкія тэмы. Са сцвярджэння Ф.Скарыны "апосталам і веруючым былі дадзены ўсе мовы, якія ёсць пад сонцам" можна, напрыклад, убачыць прызнанне Скарынам раўнапраўя ўсіх моў. У прадмове (сказанні) да "Якаўлевага саборнага паслання" Скарына заклікае людзей "перад беднымі не важнічаць, падаваць міласціну маламаёмным,.. уцякаць ад злога, не паклёпнічаць на сябра", кажа: "Нямногім настаўнікам быць, але больш умець мову сваю ўдасканальваць, бо ад яе ўсе злыя і добрыя рэчы паходзяць", папярэджвае: "Багатыя, якія пакрыўдзяць бедных, будуць пакараны". У прадмове да "Паслання да рымлян святога апостала Паўла" Скарына паглыбляе і развівае гэтую думку: "Дрэнныя будуць справядліва пакараны, а тыя, хто робіць дабро -- атрымаюць славу і мір", выказвае захапленне неабмежаванымі магчымасцямі чалавека: "І адным чалавекам раскоша (багацце) памножыцца."

Прадмова Ф.Скарыны да "Карынфам першага паслання святога апостала Паўла" сцвярджае, што "ад згоды ўсё добрае ўсякаму гораду і ўсякаму грамадству прыходзіць, нязгода ж і найвялікшыя царствы разбурае." Гэты твор вучыць не хваліцца самому сваімі здольнасцямі. Кожны хрысціянін, сцвярджаецца тут, які мае свае таленты, павінен накіроўваць іх для размнажэння простага дабра, найбольш мецьда ўсіх любоў, якая з'яўляецца найбольш дасканалай за ўсе (іншыя) таленты. Без яе нішто не бывае паспяховым. Тут жа ёсць выказванне наконт таго, што дадзенае слова ці абяцанне павінна быць для яго ўладальніка законам, чалавек павінен абавязкова выканаць сваё абяцанне.

Прадмова "Да яфесіяў паслання святога Паўла" павучае дзяцей, каб слухаліся сваіх бацькоў і шанавалі іх, а бацькоў -- каб кармілі і вучылі дзяцей сваіх, прадмова "Да філіпісіяў паслання апостала Паўла" нагадвае апошнім, каб яны ў згодзе і ўзаемнай любві жылі, "Да селунянаў паслання святога Паўла апостала першага" сказанне навучае селунянаў не дапускаць жыццёвага бруду і разбэшчанасці, ліхвярства і бясспраўя. Загадвае жыць у святасці, чысціні, любві, у выкананні спраў не чужымі, а сваімі рукамі.

Самымі каштоўнымі, на нашу думку, з'яўляюцца пераказаныя Скарынам словы з "Апостала" ў сказанні да "Другога паслання апостала Паўла да селунянаў": "Хто не хоча працаваць, няхай не есць і да справы прымушаны будзе". Тут Скарына разам з апосталам Паўлам загадвае рабіць добрыя справы, у іх узбагачацца, пакінуўшы срэбралюбства і самаўлюбёнасць.

Многія пакаленні беларускага народа, прачытаўшы гэтыя выказванні Скарыны, ажыццяўлялі іх на практыцы, узялі на ўзбраенне і зрабілі больш усяго добрага наступным пакаленням. Усім, што ў нашага народа зараз ёсць добрага, мы абавязаны і гэтай кнізе Ф.Скарыны.

Самай першай навуковай працай, апісаннем "Апостала" Ф.Скарыны, з'яўляецца артыкул П.А.Аляксеева "Разгляд славянскай старадрукаванай кнігі Апостала, якая спраўлена доктарам Францыскам Скарынаю з Полацка, надрукавана ў Вільні ў 1525г. у чвэрць ліста", што змешчаны ў кнізе "Опыт трудов Вольного российского собрания при имп. Московском университете", 1783, ч.6. С.195-204.

Самай апошняй найбольш значнай працай з'яўляецца публікацыя Я.Л.Неміроўскага "Апостал" 1525 года Францыска Скарыны: Вопыт кнігазнаўчага апісання" -- "Труды" //Гос. б-ка СССР им. В.И.Ленина. 1978. Т.14.С.186-202. Па "Апосталу" Скарыны ўсяго апублікавана 29 артыкулаў.

Кніга пражыла доўгае і цяжкае жыццё. Загінулі амаль усе экземпляры, у вядомых зніклі многія лісты. Але нельга дапусціць, што на свеце не захавалася больш экземпляраў. Недзе яны ёсць. Абавязкова ёсць і рукапіс, па якім зроблены набор. Ва ўсякім разе хоць рукапіс любой з 45-ці вядомых кніг Ф.Скарыны. Патрэбна толькі працягваць пошукі, перабраць кожную адзінку захоўвання пачатку XVI ст. у архівах і музеях Вільні, Масквы, Прагі, Кракава, Падуі і абавязкова Ватыкана. Варта толькі не пашкадаваць сродкаў і навуковых сіл.

**К.УСОВІЧ,**
**заг. музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**

Гэта цікава

## МУЖЧЫНА І ЖАНЧЫНА

*ў азначэнні амерыканскіх псіхолагаў*

• Жанчыны ў параўнанні з мужчынамі найбольш хутка авалодваюць замежнымі мовамі.

• Жанчыны аддаюць перавагу салодкім стравам, а мужчыны -- салёным.

• У жанчын музычны слых лепшы, чым у мужчын.

• Жанчыны ў тры разы часцей за мужчын размаўляюць па тэлефоне.

• Значэнне знешнасці партнёра адыгрывае дамінуючую ролю ў 22% апытаных мужчын і ў 11% жанчын.

• Хаця жанчына жыве больш гадоў, чым мужчына, працэсы яе старэння працякаюць больш хутка і больш прыкметна.

• Жанчыны ў 2 разы больш адчувальныя да ўздзеяння алкаголю, чым мужчыны.

• Псіхічныя дэпрэсіі назіраюцца ў 2 разы часцей у жанчын.

• Жанчыны лепш чуюць, спяць даўжэй за мужчын.

• Адрозненні паміж мужчынай і жанчынай -- прыроджаныя і зусім не залежаць ад выхавання.



Фота У.Чысціка

**Владимир ИВАНОВ,**
**студент 5-го курса геолого-географического факультета.**

◆◆◆

Я ошибся, знаю,
Верил и был наказан,
Но без тебя, родная,
Мир, безусловно, смазан.
Ветер подует с юга,
В нем уловлю дыханье,
Это адская мука
Осознавать расставанье.
Мне не подвластна вечность,
Так бы вернул миг встречи,
Но ухожу в бесконечность,
Как же все скоротечно!
Может быть, был многословным,
Может порой нетактичным,
Буду теперь безмолвным
И не таким хаотичным.
Тускло мне будет -- свечи
Станут моей звездою,
Я готов целую вечность
Ждать новой встречи с тобою.

## АНЕКДОТЫ

◆◆◆

Мужчына з вялікай хуткасцю нясецца па вуліцы і сустракае свайго сябра.

-- Куды гэта ты так спяшаешся? -- пытаецца той.

-- Ды вось купіў жонцы капялюшык і хачу паспець дамоў раней, чым зменіцца мода!

◆◆◆

Муж вяртаецца дамоў у пяць гадзін раніцы.

Жонка адчытвае яго:

-- З'явіцца дамоў у пяць раніцы! У мяне няма слоў!

-- І дзякуй богу...

◆◆◆

Размаўляюць два старыя сябры:

-- Ты ведаеш, -- скардзіцца адзін з іх. -- Калі я раней прыходзіў дамоў, жонка прыносіла мне хатнія тапкі, а сабака вітаў радасным гаўканнем. А цяпер усё наадварот.

**10 САКАВІКА -- ДЗЕНЬ ДОНАРА**

Усіх тых, хто праявіць міласэрнасць дзеля здароўя хворых людзей, якім неабходна донарская кроў, будуць чакаць у медпункце універсітэта ў пятніцу, 10 сакавіка, з 10 да 15 гадзін.

*спорт спорт спорт*

## ПАСПЯХОВЫЯ СТАРТЫ ЛЁГКААТЛЕТАЎ

У лютым ў г.Мінску адбыліся спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы сярод ВНУ Рэспублікі Беларусь, прысвечаныя 50-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Паспяховы старт ў пачатку спартакіяды ўзялі лёгкаатлеты нашага універсітэта, якія занялі першае агульнакамандная месца. Вялікі ўклад у перамогу нашай каманды ўнеслі студэнты факультэта фізічнай культуры. Першыя месцы занялі Анатоль Буткоўскі на трох дыстанцыях: у бегу на 800, 1500 м, у эстафеце, Алена Бычкоўская -- 800, 1500 м, Сяргей Цішкоў -- 3000 м, Генадзь Пархоменка -- 200 м, Максім Марыненка -- у сямібор'і, Наталля Сазановіч -- у пяцібор'і, Аляксандр Слюнькоў -- у эстафеце. На другім месцы Генадзь Пархоменка -- бег на 60 м, Уладзімір Сівалобаў у бегу на 2000 м з перашкодамі, на 3000 м, Аляксандр Цітоў -- 800 м, Аляксандр Слюнькоў -- 200 м, Наталля Салагуб -- 60 м.

Трэцімі прызёрамі сталі Сяргей Цішкоў і Наталля Салагуб у бегу адпаведна на 1500 і 200 м.

Падрыхтавалі каманду ГДУ да спаборніцтваў, на якіх выхаванцы факультэта фізічнай культуры паказалі высокі спартыўны клас, дацэнты Г.І.Нарскін, Ю.П.Працко, ст.выкладчык В.К.Кірэеў і выкладчык І.Л.Сівадзедаў.

**В.ЛЕМЯШКОЎ,**
**заг.кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, дацэнт.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 124
Падпісана да друку 3.03.95.